



АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ
АСТРАВЕЦКАГА АДДЗЕЛА КУЛЬТУРЫ

Адрас г.п. Астравец
вул. Набярэжная
дом 6

Тэлефон: 8-015-91-21-0-90
Эл. почта: ostrov_bibl@mail.grodno.by



**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Астравецкай ЦБС**
**Складальнік:** В.Тварагаль
**Камп'ютэрнае афармленне:** Г.Францкевіч
**Рэдактар:** В.Пінчук


пас. Гудагайская бібліятэка

Серыя "Яны прайшлі дарогамі вайны"

# Лідзія Міхайлаўна Лянкевіч

*ветэран Вялікай Айчыннай вайны*





**1927 –**

Нарадзілася на Урале ў 1927г. Затым сям'я пераехала ў Маскву і далей — у г. Белы.

Дзяўчынцы было 14 гадоў, калі пачалася вайна. Іх дом быў разбураны бамбёжкай. Ліда з сёстрамі і маці жылі ў акупіраванай вёсцы. Маці ніколі не вагалася, што ёй рабіць у гэтай сітуацыі: яна добра ведала лес і таму пераводзіла салдат праз лінію фронта. Але аднойчы трапіла на здрадніка і, ратуючы іншых, загінула сама. Разам з іншымі ваеннапалоннымі яе растралялі на беразе р. Обша.

Тыя жудасныя хвіліны арышту маці, плач малодшых сястрычак запомніліся Лідзе на ўсё жыццё. Праз некалькі дзён разам з іншымі жыхарамі вёскі немцы пагналі дзяцей у бок Магілёва. Так Ліда апынулася ў в. Альхоўка Горацкага раёна. Трох сясцёр прытуліла добрая жанчына.

Тое, што ў суседкі хаваюцца параненыя партызаны Ліда даведалася амаль адразу. Гэтая вестка толькі падагрэла жаданне адпомсціць за маці. Ад іх вёскі да Оршы было 30км. — адлегласць даволі вялікая, тым больш для падлетка. Але менавіта туды ў шпіталь Ліда адвозіла параненых. У возе, замаскіраваным дрывамі, ляжалі партызаны, жыццё якіх залежала ад 14-гадовай дзяўчынкі. Мінуць 2 нямецкія пасты — справа рызыкоўная.

Захутаная ў хустку, пасінелая ад холаду, худзенькая дзяўчынка праязджала іх: слова "тыф" было для фашыстаў страшней партызан. Колькі такіх паездак зрабіла Ліда яна дакладна не памятала.

Непасрэдна з партызанамі Ліда не кантактавала. Заданні ёй перадаваў муж мясцовай настаўніцы, якая аднойчы і выдала іх немцам, не вытрываўшы катаванняў.

Ад смерці Ліду з сёстрамі выратаваў своечасовы прыход партыызан. Так яна апынулася ў цяжкапраходным дуброўскім лесе, у партызанскім атрадзе (1942г.). Яе, маладзенькую прыгожую, з артыстычнымі здольнасцямі, адразу залічылі ў разведку.

Адным з самых складаных і небяспечных заданняў Ліды была здабыча звестак аб складзе са зброяй. Патрэбна было ў кароткі тэрмін перадаць партызанам дакладныя каардынаты. Ліда справілася з заданнем выдатна.

У гэтым жа атрадзе Ліда дачакала канец вайны. Малодшых сясцёр яна ўладкавала ў інтэрнат, а сама працавала ў спецпрыёмніку, дапамагала тым дзецям, якія згубліся на вайне, атрымаць дакументы, уладкавацца ў жыцці, адшукаць бацькоў.

Лідзія Міхайлаўна Лянкевіч узнагароджана шэрагам медалем "За адвагу", ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені.

З 1998 года жыве ў п. Астравец